СВЯТЛАНА
ЦІХАНОЎСКАЯ
ОФІС

LT-07152 Вільнюс, Літва
вул. Укмергес 219
office@tsikhanouskaya.org

# Справаздача (аналітычны бюлетэнь) чаму выбары не могуць быць прызнаныя

**Увядзенне........................................................................................................1**
**Выбарчае заканадаўства як інструмент умацавання аўтарытарнай улады.. 2**
**«Выбары» ва ўмовах дзяржаўнага тэрору..........................................................3**
**«Выбары» ва ўмовах падаўлення свабоды слова і аб'яднанняў..................... 4**
**Фарміраванне выбарчых камісіяў для фальсіфікацыі выбараў......................5**
**Фальшывы выбар: выкарыстанне тэхнічных кандыдатаў для імітацыі дэмакратыі.........................................................................................................6**

## Увядзенне

Так званыя прэзідэнцкія «выбары» ў Беларусі з датэрміновым галасаваннем, якое пачалося 21 студзеня, і асноўным днём 26 студзеня 2025 года, не могуць лічыцца свабоднымі ці справядлівымі і ўвогуле не кваліфікуюцца як «выбары». Ніякіх альтэрнатыўных кандыдатаў, незалежных назіральнікаў ці празрыстага падліку галасоў няма. Гэта загадзя спланаванае самапрызначэнне Аляксандра Лукашэнкі, накіраванае на легітымацыю яго дыктатарскага праўлення. Дэмакратычныя сілы Беларусі заклікаюць міжнародную супольнасць адмовіцца ад прызнання гэтага фэйка, працягнуць ціск і ізаляцыю рэжыму Лукашэнкі, а таксама падтрымаць беларускія дэмакратычныя сілы на чале са Святланай Ціханоўскай у іх патрабаваннях свабодных і справядлівых выбараў, вызвалення палітвязняў, спынення рэпрэсіяў і спынення ўдзелу Беларусі ў злачыннай вайне Расіі супраць Украіны.

Прэзідэнцкія «выбары» ў Беларусі праходзяць ва ўмовах дзяржаўнага тэрору. Улады сістэматычна ўстараняюць любыя магчымасці для грамадзянскага ўдзелу. Ва ўмовах, калі незалежныя СМІ знішчаныя, грамадзянскія аб'яднанні паралізаваныя, а апазіцыйныя партыі ліквідаваныя, выбарчы працэс пераўтвораны ў фарс, які не адпавядае дэмакратычным стандартам выбараў.

Прававая база выбарчага працэсу ў Беларусі не толькі не забяспечвае дэмакратычных прынцыпаў, але і актыўна выкарыстоўваецца для ўмацавання аўтарытарнага рэжыму. Законы абмяжоўваюць удзел незалежных кандыдатаў, уводзяць строгія цэнзы і крыміналізуюць дзеянні, накіраваныя на незалежны кантроль выбараў, у тым ліку альтэрнатыўны падлік галасоў і фатаграфаванне бюлетэняў.

Выбарчыя камісіі ў Беларусі поўнасцю кантралююцца ўладай, а спісы сяброў камісій фактычна засакрэчаныя і больш не публікуюцца. Спісы іх членаў

сфарміраваныя задоўга да афіцыйнай аб'явы выбараў, і зацверджаныя пасля праверак на лаяльнасць. Ключавую ролю ў маніпуляцыях адыгрываюць так званыя «тройкі» (старшыня, намеснік старшыні, сакратар камісіі), якія адказваюць за фальсіфікацыю вынікаў галасавання. Гэтыя людзі прызначаныя з ліку правераных удзельнікаў папярэдніх фальсіфікацыяў.

Выкарыстанне тэхнічных кандыдатаў сталася асноўным інструментам для стварэння ілюзіі дэмакратычнасці выбараў. На выбарах 2025 года сярод кандыдатаў няма прадстаўнікоў рэальнай апазіцыі. Так званыя «спарынг-партнёры» дзейнага псеўдапрэзідэнта выконваюць ролю статыстаў, не прадстаўляючы пагрозы для рэжыму. Яны дапамагаюць размыць пратэстны электарат і ствараюць бачнасць палітычнай канкурэнцыі, але іх удзел накіраваны выключна на легітымацыю ўлады Аляксандра Лукашэнкі.

Такім чынам, выбары 2025 года пазбаўленыя рэальнай празрыстасці, дэмакратычнасці, а выбаршчыкі пазбаўленыя магчымасці выбару, што робіць іх фікцыяй, скіраванай на захаванне аўтарытарнага рэжыму.

## Выбарчае заканадаўства як інструмент умацавання аўтарытарнай улады

У Беларусі выбарчае заканадаўства стала інструментам умацавання аўтарытарнай улады. У апошнія гады ўлады неаднаразова мянялі законы, каб пазбавіць дэмакратычных лідараў шанцаў на ўдзел у палітычным жыцці і стварыць максімальна камфортныя ўмовы для падтрымання аўтарытарнага рэжыму.

Адной з апошніх зменаў стала ўвядзенне абмежаванняў на пасіўнае выбарчае права. Заканадаўства патрабуе ад кандыдатаў у прэзідэнты адпаведнасці строгім умовам, уключаючы ўзроставы цэнз у 40 гадоў, бесперапынны 20-гадовы стаж пражывання ў краіне, адсутнасць цяпер ці раней замежнага грамадзянства або віду на жыхарства. Гэтыя захады фактычна выключаюць тых, хто быў вымушаны эміграваць з-за рэпрэсіяў, з удзелу ў выбарах.

Яшчэ адной з прыкметных зменаў стала крыміналізацыя альтэрнатыўнага падліку галасоў, фатаграфавання бюлетэняў і заклікаў да байкоту выбараў. Гэта дазваляе ўладам прыгнятаць любую крытыку і пазбаўляць выбаршчыкаў магчымасці дакументаваць фальсіфікацыі. На папярэдніх выбарах менавіта фатаграфаванне бюлетэняў стала асноўным механізмам доказу масавых фальсіфікацыяў. Цяпер такія дзеянні пад забаронай, што ўстараняе адзін з нямногіх даступных грамадзянам спосабаў кантролю.

Дадатковыя цяжкасці стварае працэдура збору подпісаў у падтрымку кандыдатаў. Законы дазваляюць арганізоўваць збор подпісаў толькі ў спецыяльна адведзеных месцах, што абмяжоўвае незалежных кандыдатаў у іх доступе да шырокай аўдыторыі выбаршчыкаў. У той самы час на прадпрыемствах і ў дзяржаўных установах збор подпісаў за праўладных кандыдатаў праводзіцца пад ціскам з боку кіраўніцтва. Гэта груба парушае прынцыпы роўнай канкурэнцыі, бо незалежныя кандыдаты сутыкаюцца з

перашкодамі, а праўладныя атрымліваюць поўнае адміністратыўнае садзейнічанне. Аднак у бягучых фальшывых выбарах незалежных кандыдатаў не дапусцілі нават да этапу збору подпісаў за сваё вылучэнне, як гэта адбылося з апазіцыйным палітыкам, лідарам ліквідаванага ў Беларусі грамадскага руху «За свабоду» Юрыем Губарэвічам.

Выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу праяўляецца і ў арганізацыі датэрміновага і дамашняга галасавання. Гэтыя працэдуры застаюцца непразрыстымі: бюлетэні, запоўненыя датэрмінова ці дома, захоўваюцца ва ўмовах, якія не выключаюць доступу старонніх асобаў. Гэта стварае значныя магчымасці для маніпуляцыяў і падрывае давер да вынікаў галасавання.

Яшчэ адной сур'ёзнай праблемай стала рашэнне ўладаў адмовіцца ад арганізацыі галасавання за межамі краіны. Гэты крок пазбавіў каля 2 мільёнаў[1] беларусаў, якія знаходзяцца ў эміграцыі, магчымасці прыняць удзел у псеўдавыбарах. Гэтае рашэнне дадаткова падрывае легітымнасць выбарчага працэсу, выключаючы значную частку грамадства з дэмакратычнага волевыяўлення.

Сітуацыю пагоршыла раптоўнае прызначэнне «выбараў» за шэсць месяцаў да чаканай даты. На ўсю выбарчую працэдуру было пакінута толькі 95 дзён. Гэта пазбаўляе кандыдатаў роўных магчымасцей для падрыхтоўкі. Такі паспех дэманструе, як заканадаўства падганяецца пад палітычныя задачы ўлады, а не пад інтарэсы выбаршчыкаў.

У сукупнасці гэтыя захады паказваюць, што прававая база выбарчага працэсу ў Беларусі не толькі не забяспечвае дэмакратычных прынцыпаў, але і актыўна выкарыстоўваецца для ўмацавання аўтарытарнага рэжыму. Яна перашкаджае роўнасці ўдзельнікаў, выключае значную частку выбаршчыкаў з працэсу галасавання і стварае ўмовы для сістэмных маніпуляцыяў.

## «Выбары» ва ўмовах дзяржаўнага тэрору

Прэзідэнцкія «выбары» ў Беларусі праходзяць ва ўмовах маштабных рэпрэсіяў, якія ахопліваюць усе аспекты грамадска-палітычнага жыцця[2]. Пасля пратэстаў 2020 года краіна знаходзіцца ў стане перманентнага дзяржаўнага тэрору, дзе ўлады выкарыстоўваюць жорсткія меры для падаўлення любых формаў грамадзянскай актыўнасці. Гэтая атмасфера рэпрэсіяў робіць немагчымым




[1] Паводле дадзеных ААН, у 2020 годзе за межамі Беларусі жылі 1 млн. 483 тыс. 626 беларусаў. Крыніца: https://mfa.gov.by/mulateral/diaspora/ Пасля 2020 года вымушана эмігравала яшчэ каля 500 тыс. чалавек. Крыніца: https://www.dw.com/be/skolko-grazdan-rb-emigrirovali-posle-2020-goda-poslednie-dannye/a-70423532 Колькі з выбаршчыкаў, якія знаходзяцца за межамі Беларусі, вызначыць немагчыма з-за недахопу інфармацыі.

[2] Графікі і дадзеныя прыведзены з аналітычнага агляду «Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі ў 2024 годзе», Праваабарончы цэнтр «Вясна» https://spring96.org/be/news/117167

правядзенне выбараў па дэмакратычным стандартам.

Адным з галоўных інструментаў запалохвання грамадзянаў з'яўляецца сістэматычны пераслед дэмакратычных палітыкаў, актывістаў і незалежных кандыдатаў. Палітычныя актывісты падвяргаюцца арыштам, допытам,ператрусам, фізічнаму гвалту. На канец 2024 года ў месцах пазбаўлення волі знаходзілася 1265 палітвязняў, у тым ліку жанчыны, журналісты, палітычныя лідары і праваабаронцы. Некаторыя з іх утрымліваюцца ва ўмовах поўнай ізаляцыі ад знешняга свету, а чацвёра палітвязняў памерлі ў турмах за апошні год.







Пераследы датычацца і звычайных грамадзян, якія адважваюцца праявіць палітычную ці грамадзянскую актыўнасць. У сярэднім судамі ў Беларусі выносілася сем палітычна матываваных прысудаў па крымінальных справах кожны працоўны дзень. Улады актыўна выкарыстоўваюць механізмы запалохвання, такія як «прафілактычныя гутаркі» з удзельнікамі пратэстаў, ініцыятыўных групаў ці назіральнікамі мінулых выбараў.

Такім чынам, «выбары» ў Беларусі праводзяцца ва ўмовах, якія не толькі выключаюць роўнасць і свабоду, але і наўпрост пагражаюць бяспецы ўдзельнікаў выбарчага працэсу.

## «Выбары» ва ўмовах падаўлення свабоды слова і аб'яднанняў

«Выбары» ў Беларусі праходзяць ва ўмовах жорсткага падаўлення свабоды слова, права на аб'яднанні і знішчэння дэмакратычных апазіцыйных партыяў, што пазбаўляе грамадзянаў магчымасці ўдзельнічаць у палітычным жыцці і атрымліваць аб'ектыўную інфармацыю. У апошнія гады ўлады прынялі сістэматычныя намаганні для ліквідацыі любых незалежных інстытутаў, якія маглі б кінуць выклік дзейнаму рэжыму.

Беларусь з'яўляецца самай небяспечнай краінай у Еўропе для журналістаў і займае 167 (са 180) пазіцыю ў Сусветным індэксе свабоды прэсы арганізацыі «Рэпарцёры без межаў» за 2024 год. Па дадзеных Беларускай асацыяцыі журналістаў на канец 2024 года пазбаўленыя волі 45 журналістаў і супрацоўнікаў

СМІ і, паводле дадзеных Праваабарончага цэнтру «Вясна», 19 блогераў. 35 СМІ прызнаныя экстрэмісцкімі фарміраваннямі. Як заявіў Спецыяльны дакладчык па пытанні аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі, гэта больш за 4 працэнта ад агульнай колькасці журналістаў у свеце, якія знаходзяцца ў турмах[3].

Сітуацыя з правам на аб'яднанні таксама вельмі цяжкая. З 2021 года ў Беларусі было прымусова ліквідавана не менш за 1180 некамерцыйных арганізацыяў, а яшчэ 693 арганізацыі прынялі рашэнне аб самастойнай ліквідацыі пад ціскам уладаў. У іх ліку аказаліся ключавыя праваабарончыя ініцыятывы, такія як Праваабарончы цэнтр «Вясна» і Беларускі Хельсінкскі камітэт, якія адыгрывалі важную ролю ў абароне правоў чалавека і маніторынгу выбараў.

Рэпрэсіі таксама закранулі палітычныя партыі. Пасля ўвядзення новых патрабаванняў да перарэгістрацыі з 16 раней зарэгістраваных партыяў засталося ўсяго 4, і ўсе яны цалкам лаяльныя ўладзе. Цяпер гэтыя чатыры партыі выконваюць дэкаратыўную ролю, ствараючы бачнасць палітычнай канкурэнцыі, але на справе не прадстаўляюць інтарэсаў грамадства і не здольныя выступаць альтэрнатывай рэжыму.

Ва ўмовах, калі незалежныя СМІ знішчаныя, грамадзянскія аб'яднанні паралізаваныя, а дэмакратычныя партыі ліквідаваныя, выбары ў Беларусі ператвараюцца ў кантраляваны працэс, які пазбаўлены рэальнага выбару і празрыстасці. Такое падаўленне свабоды слова і права на аб'яднанні служыць падмуркам аўтарытарнага рэжыму, дазваляючы яму захоўваць уладу і душыць любую праяву іншадумства.

## Фарміраванне выбарчых камісіяў для фальсіфікацыі выбараў

Фарміраванне выбарчых камісіяў у Беларусі ўяўляе сабой строга кантралюемы працэс, цалкам падпарадкаваны інтарэсам улады і арганізаваны з мэтай легітымацыі загадзя вызначаных вынікаў фальшывых выбараў. Па дадзеных арганізацыі BelPol[4], спісы сяброў выбарчых камісіяў былі складзеныя яшчэ ў верасні 2024 года, задоўга да афіцыйнай аб'явы даты прэзідэнцкіх «выбараў». Гэтыя спісы былі зацверджаныя пасля праверак на лаяльнасць у структурах КДБ і МУС. Такая папярэдняя арганізацыя сведчыць пра тое, што выбарчыя камісіі загадзя камплектуюцца людзьмі, цалкам падкантрольнымі рэжыму.

Працэс фармавання камісіяў непразрысты і пазбаўлены канкурэнцыі. Пасяджэнні, на якіх зацвярджаліся іх склады, праходзілі за зачыненымі дзвярыма, а спісы сяброў выбарчых камісіяў не публікуюцца. Гэта робіць немагчымым грамадскі кантроль за працэдурай іх фармавання. Фармальна дапускаўся ўдзел грамадзянаў, але інфармаванне пра гэта было мінімальнае, а большасць патэнцыйных удзельнікаў альбо запалоханыя, альбо пазбаўленыя

[3] Палажэнне ў галіне права чалавека ў Беларусі. Даклад Спецыяльнага дакладчыка па пытанні аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі Анаіс Марэн. A/HRC/56/65, пункт 57 https://documents.un.org/doc/undoc/gen/g24/072/86/pdf/g2407286.pdf

[4] Даклад «Аб гатоўнасці сістэмы фальсіфікацыі выбараў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2025 года» https://belpol.pro/bezvybory-2025-dodlad-belpol/

рэальнай магчымасці вылучэння. Тыя, хто раней спрабаваў праявіць актыўнасць, сутыкнуліся з рэпрэсіямі.

Ключавым элементам сістэмы фальсіфікацыяў сталі так званыя «тройкі» – тэрмін, які ўвайшоў ва ўжыванне пачынаючы з выбараў 2020 года і шырока выкарыстоўваецца ў размовах і афіцыйнай перапісцы служачых дзяржаўных установаў. У склад тройкі ўваходзяць старшыня камісіі, ягоны намеснік і сакратар. Гэтыя тры службовыя асобы адыгрываюць цэнтральную ролю ў фальсіфікацыі выбараў, бо менавіта яны арганізуюць перадачу дадзеных вынікаў галасавання. Рэжым прызначыў на гэтыя пасады людзей, правераных у аналагічных маніпуляцыях на выбарах і рэферэндуме 2020, 2022 і 2024 гадоў. У шматлікіх афіцыйных дакументах выкарыстоўваецца фармулёўка: «Працуе ў якасці старшыні ва ўчастковай выбарчай камісіі ва ўсіх электаральных кампаніях», што падкрэслівае сістэматычны падыход да фармавання такіх групаў.

Старшыні, іх намеснікі і сакратары камісіяў не толькі займаюцца фальсіфікацыяй вынікаў галасавання, але і ціснуць на радавых сяброў камісіі. Выбарчыя камісіі, як правіла, фармуюцца з сяброў аднаго працоўнага калектыву, а ўзначальваюць камісіі звычайна кіраўнікі прадпрыемстваў ці арганізацыяў, чые супрацоўнікі ўваходзяць у камісію. Гэтыя ж арганізацыі накіроўваюць у камісію нібыта незалежных назіральнікаў для імітацыі выбарчага працэсу. Пры гэтым фармальна гэтыя супрацоўнікі дэлегуюцца ад розных арганізацыяў, такіх, як праўладныя палітычныя партыі і праўладныя няўрадавыя арганізацыі (GONGO). Кар'ера, фінансавае становішча і нават працяг працоўнай дамовы радавых сяброў камісіі наўпрост залежаць ад старшыні. Такая сістэма кантролю стварае атмасферу страху, у якой людзі вымушаныя падпарадкоўвацца патрабаванням кіраўніцтва, у тым ліку ўдзельнічаць у фальсіфікацыях.

Інструменты, якія выкарыстоўваюцца «тройкамі», уключаюць арганізацыю непразрыстага падліку галасоў, маніпуляцыі з датэрміновым і хатнім галасаваннем, а таксама перадачу скажоных дадзеных у вышэйстаячыя інстанцыі. Гэтыя дзеянні робяць выбарчы працэс у Беларусі цалкам кіруемым, у якім абвешчаныя вынікі вызначаюцца ўказаннямі кіраўніцтва, а не галасаваннем выбаршчыкаў.

Такім чынам, выбарчыя камісіі ў Беларусі не з'яўляюцца незалежным органам, які павінен забяспечваць дэмакратычнасць выбараў. Яны поўнасцю кантралююцца ўладай і выкарыстоўваюцца як інструмент для маніпуляцыяў і фальсіфікацыяў, што падрывае давер да выбарчага працэсу і робіць выбары фікцыяй.

## Фальшывы выбар: выкарыстанне тэхнічных кандыдатаў для імітацыі дэмакратыі

Выбары ў Беларусі перасталі быць механізмам дэмакратычнага волевыяўлення і ператварыліся ў кіруемы спектакль, дзе галоўную ролю іграе дзейны псеўдапрэзідэнт, а астатнія кандыдаты выконваюць функцыю статыстаў.

Выкарыстанне так званых тэхнічных кандыдатаў, ці «спарынг-партнёраў», стала асноўным інструментам для стварэння ілюзіі дэмакратычнасці выбараў.

На «выбарах» 2025 года Цэнтральная выбарчая камісія зарэгістравала пяць кандыдатаў, у тым ліку Аляксандра Лукашэнку. Сярод іх такія фігуры, як Алег Гайдукевіч, Аляксандр Хіжняк і Сяргей Сыранкоў, якія прадстаўляюць праўладныя партыі, а таксама Ганна Канапацкая. Іх удзел у «выбарах» цалкам кантралюецца дзяржаўнымі структурамі, пачынаючы ад збору подпісаў і заканчваючы правядзеннем агітацыі. Гэтыя кандыдаты не ствараюць рэальнай канкурэнцыі, а іх рыторыка часта падтрымлівае палітыку Лукашэнкі ці не ўтрымлівае значнай крытыкі дзейнага рэжыму. Напрыклад, лідар кампартыі Сяргей Сыранкоў нават не спрабуе ўтаіць, што не імкнецца да перамогі. Кандыдат-спойлер публічна заяўляе, што падтрымлівае Аляксандра Лукашэнку і што менавіта Лукашэнка набярэ больш за ўсё галасоў.

Такія тэхнічныя кандыдаты іграюць адразу некалькі роляў. Па-першае, яны запаўняюць выбарчыя бюлетэні, ствараючы бачнасць выбару для выбаршчыкаў. Па-другое, іх удзел дапамагае размыць пратэстны электарат. Калі б на выбарах быў зарэгістраваны хаця б адзін рэальны апазіцыйны кандыдат, галасы пратэстных выбаршчыкаў маглі б быць аддадзеныя яму. Але ва ўмовах, калі ў бюлетэнях няма альтэрнатывы, выбаршчыкі вымушаныя выбіраць паміж ужо вядомым Лукашэнкам і нічога не значнымі фігурамі.

Яшчэ адна важная роля тэхнічных кандыдатаў – удзел у афіцыйнай прапагандзе. Падчас тэлевізійных выступаў і дэбатаў яны не столькі прадстаўляюць свае праграмы, колькі ўзмацняюць пазіцыі Лукашэнкі. Іх заявы або паўтараюць праўладную рыторыку, або выглядаюць наўмысна слабымі, каб выгадна адцяніць вобраз дзеючага ілжэпрэзідэнта.

Такім чынам, сістэма тэхнічных кандыдатаў служыць для ўмацавання аўтарытарнага кантролю, пазбаўляючы выбаршчыкаў магчымасці рэальнага выбару. Гэта не толькі падрывае давер да выбараў, але і фармуе атмасферу безвыходнасці, дзе грамадзяне разумеюць, што іх голас не ўплывае на вынік кампаніі. Фактычна, такія «выбары» становяцца інструментам легітымацыі ўлады, пры ігнараванні волі народа.